## КАНТРОЛЬНЫЯ ТЭСТЫ ПА ТЭМЕ “СКАЗ. ТЫПЫ СКАЗАЎ”

### Тэст 1

***1. Адзначце правільнае сцверджанне:***

1) Сказ – гэта граматычна і інтанацыйна афармленая адзінка моўных зносін, у якой фармулююцца і выражаюцца думкі, пачуцці.
2) Сказ – гэта адзінка моўных зносін, у склад якой уваходзяць дзве і больш прэдыкатыўныя адзінкі, што аб’ядноўваюцца паводле сэнсу і граматычна.
3) Сказ – гэта сінтаксічна-стылістычная адзінка, што складаецца з групы цесна ўзаемазвязаных сказаў.
4) Сказ – гэта адзінка моўных зносін, у якой часткі звязаны паміж сабой падпарадкавальнымі ці злучальнымі злучнікамі.
5) Сказ – гэта адзінка моўных зносін, у якой можна вызначыць члены сказа.

***2. Адзначце асноўныя прыметы сказа:***

1) мадальнасць;
2) сэнсавая непаўната;
3) прэдыкатыўнасць;
4) эмацыянальная афарбоўка;
5) інтанацыйная афармленасць.

***3. Адзначце разнавіднасці простых сказаў паводле мэты выказвання:***

1) клічныя;
2) пытальныя;
3) сцвярджальныя;
4) ускладненыя;
5) пабуджальныя.

***4. Адзначце разнавіднасці простых сказаў паводле граматычнай структуры:***

1) апавядальныя;
2) адмоўныя;
3) клічныя;
4) ускладненыя;
5) сінтакічна падзельныя.

***5. Адзначце прыватнаадмоўныя сказы:***

1) У памяці жыве, не сціраецца і, відаць, ніколі не сатрэцца дзівосны краявід возера Доўгае (Я.Пархута).
2) Не магу не згадаць прыгажосці роднага краю (У.Караткевіч).
3) Праўленню трэба неадкладна вырашыць адну не менш важную праблему – адкрыць у калгасе філіял якога-небудзь прамысловага прадпрыемства (Я.Пархута).
4) Пятро Юстынавіч трывожыўся не дарма (Я.Пархута).
5) Сюды, на возера Доўгае, сходзіўся, з’язджаўся народ з далёкіх і не вельмі далёкіх мясцін (Я.Пархута).

***6. Адзначце складаныя сказы:***

1) А дзядзька рэй вядзе, гукае і адным крыкам памагае (Якуб Колас).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) У кузнях глуха гухкаў аб кавадла молат і цяжка соп кавальскі мех (Б.Сачанка).
3) Ля самай дарогі, пад тоўстаю, карыстаю бярозаю, мы патрапілі на невялічкае дубовае карытца, поўнае бярозавіку, і ўзрадаваліся, як дзеці (Б.Сачанка).
4) Нікла жыццё ў шумным лесе, агаляўся твар зямлі, і ляцелі ў паднябессі з звонкім крыкам жураўлі (Якуб Колас).
5) Яшчэ нядаўна вось тут шапацела, шаргацела, жаўцела, свяцілася, святкуючы свой час, лагоднае бабіна лета (Я.Сіпакоў).

***7. Адзначце двухсастаўныя сказы:***
1) Раніца светлая, сонечная (І.Шамякін).
2) Самае вялікае з беларускіх азёраў – Нарач (В.Вольскі).
3) Вось яно, наша жыццё! (М.Скрыпка).
4) Дзень сустрэч і падзей! (І.Шамякін).
5) Зараз вясна (У.Караткевіч).

***8. Адзначце неразвітыя сказы:***
1) Дзеці былі радасныя. Бацькі задаволеныя (В.Вітка).
2) Кожны з прысутных хацеў дапамагчы. Кожны з іх стаў родным і блізкім (Р.Няхай).
3) Мінск – горад зеляніны (У.Караткевіч).
4) Вось яно, наша жыццё! (М.Скрыпка).
5) Без хлеба няма абеда (У.Корбан).

***9. Адзначце ўскладненыя сказы:***
1) Нізкія воблачкі, шчодра пасыпаўшы снегам зямлю, падняліся вышэй (Якуб Колас).
2) На вуліцы пасвятлела, хоць ужо надыходзіў вечар (Якуб Колас).
3) Канец верасня. Па-ранейшаму цёпла, як летам (І.Навуменка).
4) Летняя раніца, свежая, росная (І.Пташнікаў).
5) Незадоўга перад вечарам сабралася на дождж (Т.Хадкевіч).

***10. Адзначце асноўныя прыметы няпоўнага сказа:***
1) сінтаксічны час;
2) мадальнасць;
3) сэнсавая непаўната;
4) граматычная непаўната;
5) эмацыянальная афарбоўка.

***11. Адзначце няпоўныя сказы:***
1) Пад навіссю дрэў – стары вагончык (Я.Пархута).
2) Снегапад. Белая iгліца (Р.Барадулін).
3) – Госці прыехалі? – Прыехалі. – А машыны яшчэ стаяць? – стаяць, але хутка паедуць (У.Караткевіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) За вёскай густы ельнік (Я.Брыль).
5) Народу! А снегу, снегу! (Я.Маўр)

***12. Адзначце эліптычныя сказы:***
1) На рагу вуліцы старая каплічка (У.Караткевіч).
2) Ноч. Дванаццатая гадзіна. Паўшар'е парыпвала воссю сухой (Р.Барадулін).
3) Як прыемна прайсціся аднаму па дарозе ў добрым настроі (І.Шамякін).
4) – Хто адказваў? – Сусед па парце.
5) На сцэне – дзявочы хор. Ніжэй – вясковы аркестр (У.Караткевіч).

**Тэст 2**

***Адзначце правільнае сцверджанне:***
1) Няпоўны сказ – гэта сказ, у якім адсутнічае канструкцыйна неабходны галоўны ці даданы член сказа, што ўспрымаюцца з папярэдняга кантэксту ці сітуацыі.
2) Няпоўны сказ – гэта сказ, у якім адсутнічае выказнік, што не ўзнаўляецца з папярэдняга кантэксту, а сэнсавая паўната сказа выражаецца яго лексіка-граматычнымі сродкамі.
3) Няпоўны сказ – гэта асобы структурна-семантычны тып простага сказа з адным граматычным саставам дзейніка або выказніка.
4) Няпоўны сказ – гэта сказ, які мае адну граматычную аснову, што ўтвараецца яго галоўнымі членамі.
5) Няпоўны сказ – гэта сказ, у якім можна вызначыць члены сказа.

***2. Мадальнасць сказа выражаецца:***
1) формамі часу дзеяслова;
2) катэгорыяй трывання дзеяслова;
3) катэгорыяй ладу дзеяслова;
4) формамі звязкі ў выказніку;
5) катэгорыяй ліку дзеяслова.

***3. Адзначце разнавіднасці сказаў паводле эмацыянальнай афарбоўкі:***
1) адмоўныя;
2) пытальна-рытарычныя;
3) пытальна-пабуджальныя;
4) апавядальныя;
5) клічныя.

***4. Адзначце разнавіднасці простых сказаў паводле граматычнай структуры:***
1) аднасастаўныя;
2) развітыя;
3) няпоўныя;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) сінтаксічна непадзельныя;
5) сцвярджальныя.

***5. Адзначце агульнаадмоўныя сказы:***
1) Доўга людзі ўдзень блудзілі, крыўду, слёзы, кроў пладзілі, ўсё не ўмелі жыць (Янка Купала).
2) Відаць, не адзін яе [сілявы] гуллівы або напалоханы шчупакамі касяк напароўся на нябачную капронавую смерць (Я.Брыль).
3) Міхась не ўтрымаўся, дазволіў напаіць коней і пакупацца (А.Асіпенка).
4) А таму і не бяда: усё нібы з гусі вада (К.Крапіва).
5) Вучаць, выхоўваюць не падручнікі, не методыкі – вучыць, выхоўвае настаўнік (В.Вітка).

***6. Адзначце складаныя сказы:***
1) Азевіч наважыўся ісці, як сцямнее, цераз поле, мінаючы жахлівы той роў (В.Быкаў).
2) Палякі, прыкмеціў Апейка, трымаліся купкамі, каля мэстэчка, у засценку (І.Мележ).
3) Узнімаючы беларусаў, літоўцаў, палякаў на паўстанне супраць рускага самаўладдства, Кастусь Каліноўскі ніколі не атаясамліваў яго з рускімі ўвогуле, марыў пра будучую федэрацыю вольных народаў (А.Мальдзіс).
4) Як паказалі даследаванні, Вільня была заснавана крывічамі (М.Ермаловіч).
5) За старой асінай, за  выжарамі густа, як ад пажару, палымнела неба: там толькі што села сонца (А.Кудравец).

***7. Адзначце двухсастаўныя сказы:***
1) Прыгожы дзень, сонечны, ясны (Якуб Колас).
2) Дзве работы за раз не зробіш (Прыказка).
3) Невялікая рэчка. Гай, напоўнены птушынымі спевамі (У.Караткевіч).
4) Успамінаецца маладосць (У.Караткевіч).
5) Абапал невялікай рачулкі густыя кусты лазняку і ракітніку (Б.Мікуліч).

***8. Адзначце неразвітыя сказы:***
1) Хлопчык быў выдатнікам (В.Вітка).
2) Будзем падмуркі і цэглу мы класці (П.Броўка).
3) Дзед з унукам сталі пераможцамі (Р.Няхай).
4) Раскутая песня не будзе больш плакаць (М.Танк).
5) Чаромха цвіла і, укрытая белай квеценню, быццам мігцела (У.Караткевіч).

***9. Адзначце ўскладненыя сказы:***
1) Пад шэлест лісця, пад птушыны спеў, апалены апошняй навальніцай, расою цёплай вымыты, даспеў тугі, каляны жолуд над крыніцай (С.Грахоўскі).
2) На вуліцы, як і раней, мітусіўся снег (Якуб Колас).
3) Здавалася, не будзе канца лютай сіле завірухі (Якуб Колас).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) Над палямі стаіць песня жаўранкаў (Я.Брыль).
5) Ляжыць Міколка ні жывы ні мёртвы (М.Лынькоў).

***10. Адзначце асноўныя прыметы элептычнага сказа:***
1) граматычная непаўната;
2) сэнсавая непаўната;
3) пытальная інтанацыя;
4) эмацыянальная афарбоўка;
5) сінтаксічны час.

***11. Адзначце няпоўныя сказы:***
1) “Хадзем, хлопцы”. – “Куды?” – На сход (М.Зарэцкі).
2) Гэта было бяскрайняе зорнае неба, а пад ім спакойная і цёплая вада (Я.Брыль).
3) Высока ў небе зазвінеў ранні жаваранак (І.Шамякін).
4) Са смагі поўны п’ю карэц халоднага бярозавага соку (В.Вітка).
5) Нідзе не відно і не чутно нікога (К.Чорны).

***12. Адзначце элептычныя сказы:***
1) Хораша на душы сярод прыроды пад зорным вечным небам (В.Хомчанка).
2) За спевы тыя Какаду давалі смачную яду (К.Крапіва).
3) А птушак, птушак! (М.Скрыпка).
4) Белая ноч на дварэ (М.Танк).
5) Над полем празрыстая сінь майскага неба (П.Галавач).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ